# Нашы юбіляры

## УЛАДЗІМІР МІХАЙЛАВІЧ ЛАЗОЎСКІ



Споўнілася шэсцьдзесят гадоў Уладзіміру Міхайлавічу Лазоўскаму — мовазнаўцу, педагогу, прафесару кафедры сучаснай беларускай мовы, намесніку дэкана філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Нарадзіўся ён 14 студзеня 1934 г. у вёсцы Нянькава Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці. Прага да ведаў прывяла дапытлівага юнака пасля заканчэння Любчанскай сярэдняй школы ў 1951 г. на філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта, дзе праз пяць гадоў Уладзімір Міхайлавіч атрымаў дыплом філолага. Два гады (1956—1958) працаваў ён на Віцебшчыне —спачатку настаўнікам, а затым дырэктарам Слабадской сярэдняй школы Шаркаўшчынскага раёна. У 1958 г. паступіў у аспірантуру БДУ па кафедры беларускай мовы. З таго часу педагагічная, навуковая і грамадская дзейнасць Уладзіміра Міхайлавіча знітавана з жыццём філалагічнага факультэта. Тут пачалася і паспяхова працягваецца яго педагагічная дзейнасць: з 1961 г. ён — выкладчык кафедры беларускай мовы, з 1964 г. — старшы выкладчык, з 1971 г. — дацэнт, з 1993 г. — прафесар.

У. М. Лазоўскі распрацаваў і вядзе мовазнаўчыя курсы і спецкурсы па сучаснай беларускай мове і яе гісторыі, у сааўтарстве з калегамі стварыў праграмы па сучаснай беларускай мове для студэнтаў аддзяленняў беларускай мовы і літаратуры, рускай мовы і літаратуры, нямецкіх студэнтаў, а таксама падручнікі і дапаможнікі «Сучасная беларуская мова: Лексікалогія. Фразеалогія» (1984), «Сучасная беларуская мова: Практычныя заняткі» (1989). Яго шматлікія выпускнікі працуюць у розных кутках Беларусі і за яе межамі — у сярэдніх школах, ва ўстановах адукацыі, навукі, культуры, у сродках масавай інфармацыі. Працяглы час (1981—1985) Уладзімір Міхайлавіч выкладаў беларускую мову ў Берлінскім універсітэце імя В. Гумбальта.

Аб'ект навуковых даследаванняў У. М. Лазоўскага — лексіка беларускай літаратурнай мовы і жывых народных гаворак. У 1966 г. ён паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Юрыдычная тэрміналогія ў мове беларускіх пісьмовых помнікаў XV—XVII стст.». Затым з яго ўдзелам былі падрыхтаваны і выдадзены ў трох выпусках «Матэрыялы для слоўніка мінска-маладзечанскіх гаворак» (1975, 1979, 1985) — плён шматгадовай калектыўнай працы. Вынікам вывучэння антанімічнай лексікі сучаснай беларускай мовы з'яўляецца «Слоўнік антонімаў беларускай мовы: Канкрэтныя выпадкі ўжывання» (1993) — першая ў беларускім мовазнаўстве лексікаграфічная праца такога тыпу.

З 1966 г. У. М. Лазоўскі працуе намеснікам дэкана філалагічнага факультэта, аддаючы многа часу і ўвагі складанню вучэбных планаў, арганізацыі вучэбнага працэсу, быту і адпачынку выкладчыкаў і студэнтаў. За плённую працу ў Берлінскім універсітэце ён узнагароджаны ганаровым залатым медалём Гердэра.

Свой юбілей Уладзімір Міхайлавіч сустрэў у клопаце пра лёс факультэта і універсітэта, пра лёс роднага слова. Жадаем яму моцнага здароўя, творчых поспехаў, здзяйснення ўсіх планаў і задумак!

Супрацоўнікі кафедры сучаснай беларускай мовы
і кафедры гісторыі беларускай мовы